ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік упраўлення культуры
Гродзенскага аблвыканкама
А.В. Клімовіч
2024 г.

ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі і правядзення
абласнога фестывалю народных тэатральных калектываў
"Лідскія тэатральныя сустрэчы"

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю народных тэатральных калектываў "Лідскія тэатральныя сустрэчы" (далей – Фестываль).

2. Мэтамі і задачамі Фестывалю з'яўляюцца: умацаванне ролі і папулярызацыя народных тэатраў вобласці; падтрымка, стымуляванне і развіццё аматарскай творчасці; удасканальванне выканальніцкага майстэрства, развіццё творчых здольнасцей удзельнікаў аматарскіх калектываў; пошук новых сцэнічных формаў ажыццяўлення тэатральных пастановак; пашырэнне і ўзмацненне ўплыву аматарскіх тэатраў на ўзровень эстэтычнай культуры насельніцтва; стварэнне новых і ўмацаванне дзеючых калектываў.

3. Арганізатарамі Фестывалю з'яўляюцца: упраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама, дзяржаўная ўстанова культуры "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці" (далей – ДУК "Гродзенскі АМЦНТ"), аддзел культуры Лідскага райвыканкама (дадатак 1).

4. Фестываль праводзіцца 1 раз у 2 гады.

5. У 2024 годзе Фестываль адбудзецца 23 лістапада на базе дзяржаўнай установы "Палац культуры горада Ліды".

6. Арганізатарамі Фестывалю дапускаюцца змены ў дадзенай Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю народных тэатральных калектываў "Лідскія тэатральныя сустрэчы".

7. Праграма Фестывалю прадугледжвае ўрачыстае адкрыццё, конкурсныя прагляды, падвядзенне вынікаў і ўзнагароджванне пераможцаў дыпломамі ў рамках і прызамі.

8. У Фестывалі прымаюць удзел лепшыя народныя аматарскія тэатральныя калектывы незалежна ад ведамаснай прыналежнасці.

9. У якасці гасцей могуць быць запрошаны Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь, а таксама аматарскія тэатры з іншых рэгіёнаў Беларусі.

10. Калектывы могуць выкарыстоўваць для пастаноўкі спектакляў творы нацыянальнай ці сусветнай драматургіі, аўтарскія творы на беларускай (рускай) мове.

11. Да паказу прадстаўляецца спектакль працягласцю да 60 хвілін.

12. Фестываль праводзіцца ў два этапы:

- першы этап: каллектывы прадстаўляюць відэаверсію спектакля арганізатарам Фестывалю да 1 жніўня 2024 года;

- другі этап: адбудзецца 23 лістапада 2024 года, у якім прымаюць удзел лепшыя калектывы, якія прайшлі папярэдні адбор па выніках першага этапу.

13. Журы Фестывалю (дадатак 2) вызначае лаўрэатаў (I, II, III ступеняў) і ўзнагароджвае іх прызамі і дыпломамі ў рамках.

14. Спецыяльнымі прызамі і дыпломамі ў рамках узнагароджваюцца пераможцы ў наступных намінацыях:
- “За лепшую рэжысуру”;
- “За лепшае сцэнічнае ўвасабленне твораў беларускай нацыянальнай драматургіі”;
- “За лепшую жаночую ролю”;
- “За лепшую мужчынскую ролю”.

15. Пры падвядзенні вынікаў Фестывалю журы карыстаецца наступнымі крытэрыямі: майстэрства рэжысёра, акцёрскае майстэрства, сцэнаграфія, музычнае афармленне, касцюміраванне.

16. Журы мае права змяняць, вызначаць дадатковыя намінацыі ў рамках выдзеленага прызавога фонду.

17. Рашэнне членаў журы па выніках Фестывалю фіксуецца ў пратаколе (падпісваюць усе члены журы), які размяшчаецца на афіцыйным сайце ДУК “Гродзенскі АМЦНТ” на працягу да 10 каляндарных дзён з моманту правядзення Фестывалю.

18. Рашэнне журы з’яўляецца канчатковым і перагляду не падлягае.

19. Лепшыя калектывы будуць прапанаваны для ўдзелу ў абласных, рэспубліканскіх мерапрыемствах, фестывалях тэатральнага мастацтва.

20. Для ўдзелу ў Фестывалі неабходна даслаць заяўку (дадатак 3) з пазнакай “Лідскія тэатральныя сустрэчы” да 1 сакавіка 2024 года па адрасе: 230025, г. Гродна, вул. Савецкая, 8, ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”, тэл. +375 152 623799, тэл/факс: +375 152 623787, e-mail: info@gromc.by.

21. Фінансаванне Фестывалю ажыццяўляецца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных у каштарысе ДУК “Гродзенскі АМЦНТ” на цэнтралізаваныя мерапрыемствы.

22. За кошт бюджэтных сродкаў фінансуюцца: набыццё прызоў і спецыяльных прызоў, дыпломаў і рамак для дыпломаў.

23. Для фінансавання Фестывалю могуць быць выкарыстаны іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

24. Аргкамітэт пакідае за сабой права ўносіць змены ў дадзеную Інструкцыю аб парадку арганізацыі і правядзення, а таксама перанос даты правядзення Фестывалю (у іншыя тэрміны).

25. Арганізатары Фестывалю захоўваюць неабмежаваныя правы на запіс і распаўсюджванне выступленняў калектываў рознымі тэхнічнымі сродкамі і спосабамі. За дадзеныя запісы ганарары выканаўцам не выплачваюцца.

Дадатак 1
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю тэатральных калектываў “Лідскія тэатральныя сустрэчы”

# СКЛАД АРГКАМІТЭТА
## абласнога фестывалю народных тэатральных калектываў “Лідскія тэатральныя сустрэчы”

Уладыка Г.А. – намеснік старшыні Лідскага райвыканкама, *старшыня аргкамітэта (са згоды);*

Клімовіч А.В. – начальнік упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, *сустаршыня аргкамітэта;*

Баргановіч В.Т. – намеснік начальніка аддзела культурна-асветнай работы, мастацтваў і навучальных установ Гродзенскага аблвыканкама, *намеснік старшыні аргкамітэта;*

Леўшунова Н.Ф. – начальнік аддзела культуры Лідскага райвыканкама;

Мерчы Т.І. – вядучы метадыст ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”;

Пекар А.Ю. – галоўны спецыяліст аддзела культурна-асветнай работы, мастацтваў і навучальных установ Гродзенскага аблвыканкама;

Тур І.Э. – дырэктар ДУ “Палац культуры горада Ліды”;

Хільмончык К.В. – дырэктар ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”

Дадатак 2
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю тэатральных калектываў “Лідскія тэатральныя сустрэчы”

## СКЛАД ЖУРЫ
абласнога фестывалю народных тэатральных калектываў
“Лідскія тэатральныя сустрэчы”

| | |
|---|---|
| Калагрыў А.А. | – акцёр ДУК “Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь “Гродзенскі абласны драматычны тэатр”, *старшыня журы*; |
| Куратчык С.В. | – намеснік начальніка ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, *сустаршыня журы*; |
| Баргдановіч В.Т. | – намеснік начальніка аддзела культурна-асветнай работы, мастацтваў і навучальных устаноў Гродзенскага аблвыканкама, *намеснік старшыні журы*; |
| Пекар А.Ю. | – галоўны спецыяліст аддзела культурна-асветнай работы, мастацтваў і навучальных устаноў Гродзенскага аблвыканкама; |
| Пятроўская М.А. | – выкладчык тэатральных дысцыплін УА “Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў”; |
| Хільмончык К.В. | – дырэктар ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” |

Дадатак 3
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю тэатральных калектываў “Лідскія тэатральныя сустрэчы”

**Форма заяўкі**

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік (загадчык) аддзела (сектарам) культуры гар(рай)выканкама
2024 г.

**З А Я Ў К А**
на ўдзел у абласным фестывалі народных тэатральных калектываў “Лідскія тэатральныя сустрэчы”

1. Раён____________________________________________________

2. Поўная назва калектыву і базавая ўстанова дзейнасці калектыву
__________________________________________________________

3. Прозвішча, імя, імя па бацьку мастацкага кіраўніка калектыву, кантактны нумар тэлефона_______________________________________
__________________________________________________________
__________________________________________________________

4. Колькасць дзеючых асоб у спектаклі _________________________

5. Конкурсная праграма калектыву (аўтар, назва твора, іншыя звесткі)
__________________________________________________________
__________________________________________________________
__________________________________________________________

6. Працягласць выступлення і працягласць манціроўкі дэкарацыі
__________________________________________________________

7. Неабходныя тэхнічныя сродкі, светлавое абсталяванне___________
__________________________________________________________
__________________________________________________________

8. Кантактныя тэлефоны________________________________________

Кіраўнік базавай установы ________________
*(подпіс)*

Заяўку на ўдзел у фестывалі неабходна даслаць да 1 жніўня 2024 года з пазнакай “Лідскія тэатральныя сустрэчы” па адрасе: 230025, г. Гродна, вул. Савецкая, 8, ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”. Кантактныя тэлефоны ў г. Гродна: тэл. +357 152 62 37 99, тэл/факс: +375 152 62 37 87, e-mail: info@gromc.by.